Д. В. Грыцук

# БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ Ў ВЕРАСНІ 1939 Г.

*Разглядаюцца малавядомыя падзеі пачатку Другой сусветнай вайны, звязаныя з абаронай Брэсцкай крэпасці.*

Нягледзячы на вялікі інтарэс да вывучэння падзей Другой сусветнай вайны, да нашага часу застаюцца аспекты, якім удзелена мала ўвагі. Адным з іх з'яўляецца абарона Брэсцкай крэпасці часткамі Войска Польскага ў верасні 1939 г. 2 верасня 1939 г. Брэсцкую крэпасць упершыню бамбіла германская авіяцыя, пашкодзіўшы "Белы палац". У казармах крэпасці размяшчаліся маршавыя батальёны 35-га і 82-га пяхотных палкоў, шэраг іншых частак, а таксама мабілізаваныя рэзервісты, што чакалі адпраўкі ў свае падраздзяленні. Гарнізон горада і крэпасці быў падпарадкаваны аператыўнай групе "Палессе" генерала Ф. Клееберга. Начальнікам гарнізона 11 верасня быў прызначаны адстаўны брыгадны генерал К. Плісоўскі, які сфарміраваў баяздольны атрад у складзе 4 батальёнаў: трох пяхотных і інжынернага. Гарнізон меў у распараджэнні некалькі батарэй, два бранепоезды і танкі часоў Першай сусветнай вайны. На Брэст наступаў 19-ты бранятанкавы корпус генерада Г. Гудэрыяна. 14 верасня 1939 г. немцы спрабавалі захапіць горад і крэпасць з налёту, але былі адбіты палякамі. У гэты ж дзень нямецкая артылерыя і авіяцыя пачалі бамбардзіроўку крэпасці. 15 верасня пасля жорсткіх вулічных баёў немцы захапілі большую частку горада. Абараняўшыяся адступілі ў крэпасць. 16 верасня немцы пачалі штурм крэпасці, да вечара яны авалодалі грэбнем вала, але прарвацца далей не змаглі. У ноч на 17 верасня па загаду К. Плісоўскага асноўная частка польскіх войск адышлі ў Цярэспальскія ўмацаванні і адтуль у Цярэспаль. У крэпасці засталіся толькі часткі 82-га пяхотнага палка на чале з камандзірам батальёна В. Радзішэўскім, што прыкрывалі адыход асноўных сіл. Ноччу 17 верасня рэшткі батальёна з адной гарматай таемна занялі "форт Сікорскага", які немцы лічылі пустым. Яны ўвайшлі ў Цытадэль 17 верасня. 19 верасня абараняўшымся было прапанавана здацца, але В. Радзішэўскі адмовіўся. 20 верасня немцы пачалі артылерыйскі абстрэл застаўшыхся абаронцаў крэпасці. 22 верасня 1939 г. часткі 29-й танкавай брыгады Чырвонай Арміі на чале з камбрыгам С.М. Крывашэіным уступілі ў Брэст. На працягу некалькіх дзён былі прадпрыняты спробы авалодаць фортам, але беспаспяховыя. Толькі 26 верасня ў выніку масіраванага штурма абаронцы панеслі значныя страты і пакінулі крэпасць. Такім чынам, абарона Брэсцкай крэпасці ў 1939 г., якая цягнулася амаль два тыдні, паказала, што старыя фартыфікацыйныя збудаванні, абараняемыя адчайнымі храбрымі людзьмі, могуць быць сур'ёзнай перашкодай нават для значна лепш узброенага і шматкратна пераўзыходзячага па колькасці праціўніка.

### *Спіс літаратуры*

1. Норкин, А. Как защищали Брестскую крепость в сентябре 1939-го? Безумству храбрых поем мы славу!/ А. Норкин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://shkolazhizni.ru/archive/0/n-30366/. – Дата доступа: 25. 02. 2019.
2. Забытый фашистский штурм Брестской крепости в 1939 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://tverdyiznak.livejournal.com/1351855.html. – Дата доступа: 25. 02. 2019.

*Грыцук Дзмітрый Віктаравіч*, студэнт 2 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, dimon.gritsuk@mail.ru.
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by.